УДК 94(476)»1927–1934»

# ВЫПАДКІ МІЖКАНФЕСІЙНАГА ДЫЯЛОГУ ПАМІЖ ВЫДАЎЦАМІ ПРАВАСЛАЎНАЙ І КАТАЛІЦКАЙ ПРЭСЫ Ў ПЕРЫЯДЫЧНЫМ ДРУКУ (1927–1934 гг.)

**Булатая Вікторыя Юр’еўна,**
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (г. Мінск, Беларусь)

*Дадзены артыкул прысвечаны выяўленню кропак узаемадзеяння выдаўцоў праваслаўнай і каталіцкай беларускамоўнай прэсы, якая выходзіла на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1927–1934 гг. У працы вылучаюцца асноўныя вектары ўзаемадзеяння выдаўцоў, робіцца выснова, ці з’яўляецца гэтае ўзаемадзеяння адным з чыннікаў міжканфесійнага дыялогу ў Заходняй Беларусі.*

У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі прадстаўнікі беларускага руху, якія з’яўляліся вернікамі розных канфесій, выдавалі шэраг беларускамоўных перыядычных выданняў. Галоўная мэта выхаду газет і часопісаў – трансляцыя поглядаў выдаўцоў на царкоўнае і палітычнае жыццё. Адзін з фактараў, які ўплываў на адлюстраванне міжканфесійных стасункаў у матэрыялах друку – адносіны непасрэдна паміж выдаўцамі прэсы розных канфесійных і грамадскіх (палітычных) плыняў. Мэта нашага даследавання – выявіць кропкі ўзаемадзеяння выдаўцоў і вызначыць, ці ўтварае гэтае ўзаемадзеянне міжканфесійны дыялог. Падкрэслім, што міжканфесійны дыялог можа азначаць любую сустрэчу паміж прадстаўнікамі канфесій, накіраваную на падтрымку і развіццё пазітыўных узаемаадносін, якая вядзе да збліжэння і гарманізацыі [1].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

У працэсе даследавання былі прааналізаваны праваслаўныя і каталіцкія выданні, што выходзілі ў перыяд 1927–1934 гг., выдаўцамі якіх з'яўляліся беларускія рухі або іх актыўныя дзеячы. Такімі выданнямі былі:

– царкоўна-грамадскі часопіс "Праваслаўная Беларусь" (1927–1928 гг.). Орган Праваслаўнага беларускага дэмакратычнага аб'яднання (ПБДА), старшынёй якога быў сенатар В. Багдановіч, рэдагаваў часопіс а. Л. Голад;

– царкоўна-народны двухтыднёвік "Беларуская зарніца" (1928–1929 гг.). Выдаваў прот. А. Коўш, актыўны дзеяч беларускага руху;

– царкоўна-нацыянальны двухтыднёвік "Сьветач Беларусі" (1930–1933, 1936 гг.). Яго выдаўцы: Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт (ЦБПК), рэдактар – У. Більдзюкевіч;

– орган незалежнай царкоўна-грамадскай думкі, часопіс "Голас праваслаўнага беларуса" (1931–1932 гг.). Рэдагаваў часопіс М. Маркевіч;

– грамадска-рэлігійны часопіс "Царква і народ" (1932–1933 гг.). Выдавец і рэдактар – Яўхім Красоўскі, лідар праваслаўнай фракцыі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД);

– штотыднёвая газета "Biełaruskaja Krynica", друкаваны орган партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя (1917–1940 гг.);

– часопіс "Chryscijanskaja Dumka" (1928–1939 гг.), які выдаваў Адам Станкевіч, каталіцкі святар, адзін з лідараў БХД.

Аналіз матэрыялаў газет і часопісаў 1927–1934 гг. дазволіў вызначыць сферы ўзаемадзеяння выдаўцоў прэсы:

1) Узаемадзеянне выдаўцоў на палітычнай глебе.

У сувязі з выбарамі ў Польскі Сойм, якія адбываліся ў 1928 г., у матэрыялах як праваслаўных, так і каталіцкіх выданняў можна заўважыць узаемадзеянні выдаўцоў паміж сабой. Так, у некалькіх нумарах "Biełaruskaja Krynica" [2, с. 1; 3, с. 1] і ў газеце "Праваслаўная Беларусь" [4, с. 5; 5, с. 1] сустрэлася інфармацыя аб аб'яднанай партый – БХД, Сялянскі Саюз і ПБДА – у Беларускі Аб'яднаны выбарны камітэт. Паводле матэрыялаў друку, беларускія сілы гэтых трох партый аб'ядналіся для таго, каб прадставіць Блок нацыянальных меншасцей на выбарах у Польскі Сойм. З той прычыны, што газета "Biełaruskaja Krynica" – друкаваны орган БХД, а "Праваслаўная Беларусь" – орган ПДА, працэс аб'яднання партый асвятляўся і ў адным, і ў другім выданні. Прытым, абодва выдаўцоў, друкуючы праграмы, заклікалі галасаваць менавіта за аб'яднаную палітычную супольнасць.

2) Узаемны агляд і крытыка выдавецкай дзейнасці.

Кожнае выданне ў асобных рубрыках рабіла агляд прэсы, у які ўваходзіў агляд і той прэсы, якую выдавалі выдаўцы іншай канфесіі. Напрыклад "Сьветач Беларусі" [6, с. 8] рабіў агляд на матэрыялы "Biełaruskaja Krynica", "Chryscijanskaja Dumka" [7] – на часопіс "Царква і народ". Таксама "Chryscijanskaja Dumka" пісала пра выданне часопіса "Голас праваслаўнага беларуса" наступным чынам: "Змест мала цікавы, бо пасьвячаны траўлі розных ня любых "Голасу" людзей" [7]. "Голас праваслаўнага беларуса" пісаў у дачыненні да матэрыялаў газеты "Biełaruskaja Krynica" наступным чынам: "…Нашы браты з лягеру "Бел. Хрысьціянскай Дэмакратыі" – у кіраваным



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

каталіцкімі ксяндзамі яе органе “Бел. Крыніца” – з усіх сілаў бароняць “Праваслаўны Камітэт” а. Каўша…” [8, с. 23]. З гэтага можна зрабіць высновy, што паміж выдаўцом “Голаса праваслаўнага беларуса” і выдаўцамі “Biełaruskaja Krynica” была канфрантацыя.

3) Асвятленне грамадскай дзейнасці іншых выдаўцоў.

“Biełaruskaja Krynica” актыўна асвячала справу затрымання а. Каўша, а пасля – і суду над ім [9, с. 2].

4) Прадстаўленне пляцоўкі для выказвання думак іншым выдаўцам.

БХД стварыла так званую праваслаўную фракцыю, якую ўзначаліў Я. Красоўскі, выдавец праваслаўнага часопіса “Царква і Народ”. Так, па тэме ўтварэння праваслаўнай фракцыі ў “Biełaruskaja Krynica” выходзіў шэраг артыкулаў [10, с. 3]. У тым ліку, і сам Красоўскі друкаваўся ў часопісе “Biełaruskaja Krynica” [11, с. 3].

Такім чынам, разгледзеўшы асноўныя вектары ўзаемадзеяння выдаўцоў праваслаўнай і каталіцкай прэсы, можна заключыць:

1. Самы актыўны перыяд узаемадзеяння праваслаўных і каталіцкіх выдаўцоў – гэта перыяд выбарчай кампаніі ў Польскі Сойм (1927–1928 гг.). На гэтай глебе выдаўцы часопіса “Праваслаўная Беларусь” і часопіса “Biełaruskaja Krynica” аб’ядналіся ў адзін палітычны рух.

2. Найбольш актыўна асвячала дзейнасць выдаўцоў іншых канфесій газета “Biełaruskaja Krynica”. Гэта можна патлумачыць тым, што газета выходзіла раз на тыдзень працяглы час і яе выдаўцы былі найбольш за іншых заангажаваныя ў працэсы, якія адбываліся ў палітычным полі Заходняй Беларусі.

3. У матэрыялах, прысвечаных агляду прэсы, можна было назіраць крытыку выданняў іншай канфесіі. Пры гэтым, былі выкарыстаны лексічныя канструкцыі з адмоўнай канатацыяй і зместам, якія дыскрэдытавалі выдаўцоў і давалі суб’ектыўную ацэнку іх дзейнасці і поглядам.

Падсумаваўшы вышэй сказанае, адзначым, што ў акрэслены перыяд паміж выдаўцамі царкоўна-грамадскай прэсы назіраліся элементы міжканфесійнага дыялогу: аб’яднанне (хоць і часовае) выдаўцоў у адзін палітычны рух, салідарнасць на фоне палітычнага пераследу, супраца на ніве асветніцтва.

## Літаратура


1. Мельник, С. В. Межрелигиозный диалог: проблема семантики и критика основных стратегий / С. В. Мельник // Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение. Вопросы теории и практики. – 2012. – № 2 (16). – Ч. 2. – Тамбов: Грамота, 2012. – С. 129–134.
2. Biełaruskaja Krynica. – 1927. – № 51.
3. Biełaruskaja Krynica. – 1928. – № 2.
4. Праваслаўная Беларусь. – 1927. – № 1.
5. Праваслаўная Беларусь. – 1927. – № 6.
6. Сьветач Беларусі. – 1931. – № 5.
7. Chryscijanskaja Dumka. – 1932. – № 5.
8. Голас праваслаўнага беларуса. – 1932. – № 3.
9. Biełaruskaja Krynica. – 1928. – № 20.
10. Сьветач Беларусі. – 1933. – № 1.
11. Biełaruskaja Krynica. – 1928. – № 3.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова